# Школьная планета

**_НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 4 (24) Снежань 2015_**

_Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно” Мінскай вобласці_

# З НОВЫМ ГОДАМ І КАЛЯДАМІ!!!

## ЛІТАРАТУРНАЯ КАЛОНКА

### “ЗІМА”

Прыгожая зіма…
Мяцель над ёй кружыцца.
І хочацца так нам
З сябрамі весяліцца:
На санках пакатацца
І ёлку нараджаць.
… Прыгожыя шары
На ёлачцы блішчаць!..
_Лапцёнак Яна, 6 “А” клас_








## ЯКІ Ж НОВЫ ГОД БЕЗ ЕЛКІ?

Без елкі Новы год – гэта не свята. Так лічаць і вучні нашай школы, якія рабілі елкі на выставу “Елка на любы густ”.

Мяне вельмі зацікавілі гэтыя елачкі. І я вылучыла, на мой погляд, самыя лепшыя і прыгожыя. Я пагутарыла з некаторымі елачнымі “майстрамі”. І вось што я даведалася…

Лапцёнак Арцём (вучань 2 “А” класа). У яго вельмі прыгожая елачка, яму дапамагала матуля. Яны самі прыдумалі елачку з паперы і картона.

Шабан Дзіяна (вучаніца 5 “А” класа). Сваю елачку з нітак, стужачак і тканіны яна рабіла разам з сястрой.

Канстанцін Вайцяховіч (4 “Б” клас) і Лізавета Вайцяховіч (9 “Б” клас) – брат і сятра. Іх елачкі вельмі падобныя, але выкананы яны крыху з розных матэрыялаў. Косця рабіў з картона, спецыяльнай паперы і пацерак. А Ліза – з картона, паперы і сурвэтак.

На выставу былі прадстаўлены не толькі елачкі. Мяне вельмі зацікавіў снегавік. Яго зрабіла Аляксандра Звоннікава (вучаніца 1 “А” класа). Яна рабіла яго з мамай з нітак, паветраных шарыкаў і клею. Атрымаўся ну вельмі выдатны снегавік!!!

Падчас навагодніх святаў перамоўцы былі ўзнагароджаны салодкімі прызамі.

Лізавета Вайцяховіч



1 снежня 2015 года ў рамках раённай акцыі, прысвечанай міжнароднаму Дню барацьбы са СНІДам, навучэнцы нашай школы прынялі ўдзел у раенным конкурсе работ "Дрэва жыцця". Усе дзеці былі адзначаны памятнымі дыпломамі, а вучань 2"Б" класа Абазовік Павел стаў уладальнікам дыплома 1 ступені.







## Першакласнікі-пешаходы

Ў снежні было праведзена мерапрыемства для малодшых жыхароў нашай школы. "Прысвячэнне першакласнікаў у пешаходы" - менавіта так называлася мерапрыемства, у якім дзеці, акрамя ведаў, атрымалі шмат добрага настрою. Перад імі адкрылася казка, перад дзецьмі паўсталі Чырвоная Шапачка, Нязнайка і Светлафор, якія разам з Юнымі Інспектарамі Руху паведамілі, што можна і што нельга рабіць на праезнай частцы. Пасля дзеці разам з вядучымі гулялі ў тэматычныя гульні.

Усе пакінулі мерапрыемства з добрым настроем, а першакласнікам былі ўручаны флікеры і медальёны.

Алена Цэнкель

### ЛИТЕРАТУРНАЯ КОЛОНКА

Зима, в тебе снега и сильные морозы,
Ветров и вьюг сплошная череда,
До пят в искристый иней одеты все берёзы,
Но знаем мы, что это всё не навсегда.

*Кузин Александр, 6 «А» класс*

# ЯК НОВЫ ГОД СУСТРЭНЕШ, ТАК ЯГО І ПРАВЯДЗЕШ




І так, пачнём... У 1-4 класах сцэнарый прыдумвалі і ставілі як настаўнікі, так і вучні. Былі такія казачныя героі, як Лясун, Баба-Яга і Кікімара, Дзед Мароз і Снягурка. Было шмат песенек і карагодаў. І самае галоўнае: ва ўсіх дзяцей былі ўсмешкі на тварах.



Казачныя героі: Баба-Яга, Лясун і Кікімара, Дзед Мароз і Снягурка, стыліст і бландынка – весялілі і вучняў 5-11 класаў. Сцэнар атрымаўся цудоўны, на сучасны лад (дарэчы, пастаноўкай займалася настаўніца англійскай мовы Яўгенія Мікалаеўна Аўсянская). Падчас гэтай вечарыны ўсе жадаючыя маглі пабываць артыстамі. Так, вучні спявалі песні, танцавалі або ставілі сцэнкі. Пасля гэтага была дыскатэка. Было шмат конкурсаў. Аляксандр Пяхота і Макар Шпакоўскі спявалі песні (вельмі пацешна атрымалася). А Данііл







Крыжберскі, Ірына Маркевіч і Яна Аўтухова гралі на гітары і спявалі.

Гэта свята запомніцца вучням надоўга. Бо школа - найлепшы час у жыцці дзіцяці, тут адбываецца ўсё як упершыню, ды і цуды тут сустракаюцца амаль на кожным кроку.

У надыходзячым годзе Вогненнай Малпы хочацца пажадаць вам імчацца наперад, насустрач свайму шчасцю, ліха абыходзячы ўсе перашкоды, і ў гэтай вар'яцкай гонцы пад назвай "Жыццё" заўсёды быць фаварытам.

Лізавета Вайцяховіч

Дом, у якім утульна ўсім!

berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 24, снежань 2015 г.

# Незвычайныя расліны



На зямлі шмат раслін, умовы існавання якіх мы можам палепшыць. На жаль, зараз людзі робяць усё больш шкоды прыродзе. А вось мае аднакласніцы, вучаніцы 10 "Б" класа Несцяровіч Ксенія і Сай Аляксандра берагуць прыроду, дапамагаючы ёй.



Спачатку дзяўчаты прынялі ўдзел у абласным этапе аграбіялагічнага конкурса "Юны натураліст". Мэта конкурса - развіццё інтарэсу да эколага-біялагічнай дзейнасці, развіццё творчых здольнасцяў навучэнцаў. У намінацыі "Віртуальная экскурсія ў куток жывой прыроды" дзяўчаты занялі III месца, у намінацыі "Падарожжа ў краіну зёлак" – I месца, у намінацыі "Незвычайныя расліны" – I месца.

Усё лета яны працавалі над навукова-даследчым праектам па вырошчванні агароднінай расліны, якая штучна створана рукамі юнага даследчыка метадам прышчэпкі. Эксперымент на парастак агурка, што дазволіла яму стаць смачнейшым і павысіць ураджайнасць, паспяхова атрымаўся. І дзяўчаты атрымалі дыплом III ступені за перамогу ў рэспубліканскім этапе конкурса ў намінацыі "Незвычайныя расліны".

Што яны скажуць нам на гэты конт?

*Несцяровіч Ксенія:*

Наша настаўніца геаграфіі Людміла Мяфодзьеўна Макарэвіч прапанавала паўдзельнічаць у конкурсе, і мы вырашылі працаваць над тэмай, якая нам падалася вельмі цікавай. Мы даведаліся, як можна павялічыць ўраджай і зрабіць агуркі больш устойлівымі да хвароб, навучыліся прышчэпліваць. Я задаволена. Мы не толькі атрымалі дыплом на рэспубліцы, але і атрымалі шмат карысных ведаў.

*Сай Аляксандра:*

Гэты эксперымент быў вельмі цікавы наогул. Мне здаецца, любому спадабалася б яго праводзіць. Я навучылася акуратна рабіць зрэзы, хоць з першага разу не атрымалася зрабіць гэта правільна. Даведалася, што можна як бы "крыжаваць" гарбуз і агуркі, каб яны былі смачнейшымі і лепшымі, бо карані гарбузоў вельмі доўгія і яны ўсмоктваюць больш вады, а агуркам , як мы ведаем, трэба шмат вады.

Мы рабілі эсперымент два разы. У першы раз не атрымалася. А вось у другі раз усё атрымалася. Так, агуркі атрымаліся вельмі вялікія і даволі смачныя.





МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ДЫПЛОМ

III ступені

УЗНАГАРОДЖВАЕЦЦА

творчы калектыў навучэнцаў
ДУА "Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно"
Мінскай вобласці
(кіраўнік Макарэвіч Л.М.)

пераможца аграбіялагічнага конкурсу
"Юны натураліст"
(намінацыя "Незвычайныя расліны")
у рамках рэспубліканскай акцыі навучэнскай моладзі
"Жыву ў Беларусі і тым ганаруся"

Намеснік Міністра В.В. Якжык

2015 г.
НДЦ "Зубронак"

Дзяўчынкі засталіся задаволены. Кожны з нас можа паўтарыць такі ж экперымент, а, можа, прыдумае нешта сваё… Мы павінны імкнуцца да новага!

Алена Цэнкель

Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 24, снежань 2015 г.

# Мы – агітбрыгада «Энергетык» (6 «Б» клас)
# Наш дэвіз: «Хто? Як не мы? Калі? Як не цяпер?







## Энергазберажэнне для дзяцей

Кожнаму з нас хочацца, каб яго дом быў утульным, камфортным, непаўторным. Менавіта для гэтага ў сем'ях павінны існаваць традыцыі, якія дзеці павінны пераняць і перанесці ў свае будучыя сем'і. Пра традыцыі беражлівасці, аб з'яўленні навыкаў энергазберажэння паведала нам агітбрыгада "Энергетык".

**Простыя правілы добрага гаспадара.**

• Закрывайце кран, пакуль чысціце зубы ці карыстайцеся шклянкай для паласкання рота.

• Мыйце посуд не пад бягучай бруёй вады, а ў ракавіне, зачыніўшы адтуліну коркам.

• Галоўнае - не забывайце выключаць ваду!

Выкананне гэтых правілаў дазволіць за год зэканоміць цэлае возера дыяметрам 200 метраў і глыбінёй 2 метры. Акрамя гэтага, вы эканоміце энергію, якая выкарыстоўваецца на нагрэў вады і перапампоўку.

## Што можна зрабіць, каб лямпа дарэмна не свяціла?

Сярэдні расход электраэнергіі на асвятленне кватэры складае прыкладна 1 кВт. г у дзень (пры выкарыстанні лямпаў напальвання). Але і гэты расход можна скараціць, калі замяніць лямпы напальвання, люмінесцэнтнымі. 60 Вт лямпа напальвання адпавядае 18 Вт люмінесцэнтнай лямпе пры адным і тым жа ўзроўні асветленасці. Тэрмін эксплуатацыі люмінесцэнтных лямпаў у 6 – 8 вышэй, чым у лямпаў напальвання.

## Як дапамагчы халадзільніку?

Аптымальным месцам для халадзільніка на кухні з'яўляецца самае прахалоднае месца. Пры вонкавай тэмпературы 20 градусаў халадзільнік расходуе на 6% менш энергіі. Не стаўце халадзільнік паблізу батарэі або іншых ацяпляльных прыбораў. Вельмі адмоўна на працы халадзільніка адбіваецца і вялікае "футра" ў маразільніку. Таму не залянуйцеся яго лішні раз адтаць.

Цяпер - халодны час года. Мы з вамі ходзім па цёплай кватэры. Але бывае, у зімовы перыяд мы скардзімся на холад у нашых кватэрах. Ці ўсё мы самі зрабілі, каб захаваць у нашых дамах каштоўнае цяпло?

## Як мы можам захаваць цяпло ў нашых дамах?

• Восенню ўцяпляйце ў хаце ўсе вокны, балконы і дзверы.

• Зачыняйце дзверы ў пад'ездзе.

• Не трымайце форткі пастаянна адчыненымі.

• На ноч завешвайце фіранкі, каб дадаткова ўтрымаць цяпло.

• Адстаўце ад батарэі канапу і стол, каб цяпло свабодна праходзіла ў вашу кватэру.

За кошт гэтых простых мерапрыемстваў вам удасца скараціць выдаткі на ацяпленне кватэры прыкладна на 5-10%.

# Акцыя "Нашы дзеці"







## Бяспечныя святы

Катэгарычна забараняецца:

• Выкарыстоўваць набытую піратэхніку да азнаямлення з інструкцыяй;

• Прымяняць піратэхніку пры ветры больш за 5 м/с;

• Падрываць піратэхніку, калі ў небяспечнай зоне знаходзяцца людзі, жывелы, гаручыя матэрыялы, будынкі;

• Запускаць салюты з рук;

• Нахіляцца над вырабам падчас яго выкарыстання;

• Выкарыстоўваць вырабы са скончаным тэрмінам прыдатнасці, з бачнымі пашкоджаннямі;

• Выкарыстоўваць піратэхніку ў закрытых памяшканнях, кватэрах, (акрамя хлапушак, бенгальскіх агнёў і фантанаў, дазволеных да ўжывання ў закрытых памяшканнях), а гэтак жа запускаць салюты з балконаў і лоджый;

• Дазваляць дзецям самастойна прыводзіць у дзеянне піратэхнічныя вырабы;

• Выкарыстанне непаўналетнімі піратэхнічных вырабаў;

• Сушыць намоклыя піратэхнічныя вырабы на ацяпляльных прыборах.









19 снежня 2015 года ў ДУА «Сярэдняя школа №2 г. Беразіно» было праведзена Першынства Бярэзінскага раёна па міні-арыентаванні або арыентаванні ў памяшканнях ***(«Арыент-Шоў»).*** Спаборніцтвы праходзілі па ўсіх паверхах школы і сабралі больш за 100 удзельнікаў з раёна, а таксама г. Жодзіна і клуба спартыўнага арыентавання «Белая Русь» Мінскага раёна. Спартсмены і ўсе жадаючыя спаборнічалі на дыстанцыях рознай складанасці і працягласці ад 9 да 30 кантрольных пунктаў.

Самаму юнаму арыентыроўшчыку, які прайшоў дыстанцыю пакуль яшчэ пры дапамозе бацькоў, нядаўна споўнілася 4 гады, а самаму старэйшаму - ўжо больш за 50 год.






***Падведзены вынікі першага паўгоддзя 2015 - 2016 навучальнага года. Вучні - выдатнікі вучобы, пераможцы інтэлектуальных і спартыўных конкурсаў, алімпіяд атрымалі граматы і прэміі.***









## Старонка педагога-псіхолага

# Прычыны ўзнікнення камп'ютарнай залежнасці



*1.Адсутнасць навыкаў самакантролю ў дзіцяці.* Такі чалавек не ўмее сябе кантраляваць, абмяжоўваць, «тармазіць», ён робіць не думаючы.

*2.Дзіця не прывучана да працы*, да ўмення бачыць працу і выконваць яе. Такі чалавек не адчувае патрэбы працаваць у імя блізкіх, выказваючы гэтым сваю любоў і клопат аб іх.

*3.Дзіцяці не прывучылі да супрацоўніцтва*, ён не навучаны раіцца, а значыць слухаць і самае галоўнае — чуць парады і рэкамендацыі. Такая «глухата» пачынаецца ў падлеткавым узросце, і дарослыя раптам аказваюцца зусім бездапаможнымі.

*4. Дзеці, пазбаўленыя бацькоўскай увагі*, задавальняюць патрэбу ў цяпле і зносінах, узаемадзейнічаючы з камп'ютарам.



*5.Стыль выхавання ў сям'і пабудаваны на указаннях.* Выхоўваюць асобу, якая ў выніку ўсе роўна не ўмее падпарадкоўвацца і слухацца.

*6.Замкнёнасць дзіцяці.*

*7.Адсутнасць кантролю з боку бацькоў*, бескантрольнасць асабістага часу, няўменне самастойна арганізаваць свой вольны час.

8.Празмернае захапленне камп'ютарам, вельмі верагодна, з'яўляецца індыкатарам стану *дзіцяці, які не знаходзіць сябе ў рэальным свеце* і таму апускаецца ў віртуальны свет.

Алена Кузіна

## *ЛІТАРАТУРНАЯ КАЛОНКА*

### *“ЗІМУШКА-ЗІМА”*

О, зімушка-зіма,
Ты самая цудоўная пара.
Прыйшла да нас са сцюжамі,
Завеі прывяла.
Укатала зямельку бялюткі дыванам,
Ахінула адзінокія стагі лугоў.
Ты дрэўца кожнае апранула кажушком
Ды рэчаньку скавала бліскучым лядком.
І хаты не мінула,
Стрэхам шапкі апранула,
Каб іскрылась, зіхацела
І ўсё навокал прасвятлела.

*Папкова Дзіяна, 6 “А” клас*

ДУА “Сярэдняя школа № 2
горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета”
выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба
“Юны журналіст”: Галуза
Яўгенія, Цэнкель Алена,
Вайцяховіч Лізавета,
Власюк Марыя, Маркевіч
Ірына

ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

**Школьная планета**